© Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа

***Лупсякова А. У.**, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 11 г. Жлобіна Гомельскай вобласці*

# Гульня «Даміно». Беларуская мова

Мэтай навучання беларускай мове з'яўляецца авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа. Як вядома, гэтаму немагчыма навучыць, пакуль у вучняў не будзе багаты лексічны запас. Таму ўжо з I класса пачынаю пашыраць слоўнікавы запас. Для гэтага мы выкарыстоўваем гульню «Даміно».

***Задачы гульні «Даміно»:***

- стварыць умовы для пашырэння слоўнікавага запасу вучняў;
- развіць ў навучэнцаў пачуццё прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці роднай мовы;
- выклікаць цікавасць да вывучэння мовы.

У II–IV класах гэтую гульню можна выкарыстоўваць на «моўных хвілінках». Карткі для гульні «Даміно» падзялены на розныя лексічныя групы: агародніна, садавіна, ягады, звяры і насякомыя, птушкі і гэтак далей.

***Правілы гульні.*** Настаўнік размяшчае першую картку, у якой злева намалявана зорка. На другой палове напісана слова на рускай мове. Задача наступных удзельнікаў — знайсці картку, на якой гэтае слова будзе запісана па-беларуску. Так збіраецца ланцужок, пакуль на дошцы не з'явіцца апошняя картка, на якой зорка будзе з правага боку.

На факультатыўных і стымулюючых занятках можна выкарыстоўваць гэтыя карткі для работы ў парах, групах.